# МАРАЛЬНА-ЭТЫЧНАЕ І ЭСТЭТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ, ІХ ПРЫНЦЫПЫ І МЕТАДЫ

Камянчук Валерыя Вадзімаўна
УА “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна”

Чалавек жыве ў грамадстве і знаходзіцца ў мностве грамадскіх і асабістых сувязяў паміж іншымі людзьмі. Ён павінен ўзгадняць сваю дзейнасць з іншымі членамі грамадства; падпарадкоўвацца пэўным нормам, правілам. Кожнае грамадства выпрацоўвае свае правілы і нормы, якія рэгулююць паводзіны чалавека ў сям’і, у працы, у грамадстве, у дачыненні да прыроды і навакольнага свету. Працэс засваення гэтых нормаў можна разглядаць як працэс бесперапынны, ён працякае на працягу ўсяго жыцця чалавека. Аднак найбольшы аб’ём нормаў і правілаў закладваецца на ранніх этапах станаўлення чалавека як асобы, а менавіта ў школе. Ажыццяўляецца гэта шляхам маральна-этычнага і эстэтычнага выхавання.

У наш час праблема эстэтычнага выхавання, развіцця асобы, фарміравання яе эстэтычнай культуры, – адна з найважнейшых задач, якія стаяць перад школай. Па-першае, гэта працэс мэтанакіраванага ўздзеяння. Па-другое, гэта фарміраванне здольнасці ўспрымаць і бачыць прыгажосць у мастацтве і жыцці, прыродзе, асяроддзі людзей, успрымаць яе. Па-трэцяе, задача эстэтычнага выхавання – фарміраванне эстэтычных густаў і ідэалаў асобы. І, нарэшце, па-чацвёртае, – развіццё здольнасці да самастойнай творчасці і стварэння прыгожага. Усё пералічанае немагчыма без фарміравання такіх кампанентаў эстэтычнай свядомасці, як цікавасць, успрыманне, пачуццёвасць, патрэбнасць. Эстэтычная цікавасць звязана з атрыманнем асалоды ад дзеянняў, якія звязаны са знаёмствам з аб’ектамі мастацтва. Эстэтычнае ўстрыманне фарміруецца толькі тады, калі аб’ект успрымання зразумелы вучню, можа выклыкаць у яго эмоцыі (радасць, гнеў, узрушэнне, цікавасць і інш.). толькі ў непасрэдных зносінах з эстэтычнымі аб’ектамі. Эстэтычныя патрэбнасці будуць сфарміраваны толькі тады, калі вучань будзе уключаны непасрэдна ў эстэтычную дзейнасць.

Вельмі важна ў наш час і маральнае выхаванне. Яшчэ В. А. Сухамлінскі пісаў аб тым, што неабходна займацца маральным выхаваннем вучняў, вучыць «уменню адчуваць чалавека». Ён лічыў, што непарушная аснова маральнага перакanання закладваецца ў дзяцінстве і раннім узросце, калі дабро і зло, гонар і ганьба, справядлівасць і несправядлівасць, даступны разуменню вучня толькі пры ўмове яркай нагляднасці, відавочнасці маральнага сэнсу таго, што ён бачыць, робіць,

назірае. Разглядаючы маральнае выхаванне як сістэму, Н. Е. Кавалёў, Б. Ф. Райскі, Н. Я. Сарокін адрозніваюць некалькі аспектаў:

–ажыццяўленне ўзгодненых выхаваўчых уплываў настаўніка і калектыву вучняў на вырашэнне пэўных педагагічных задач, а ўнутры класа – адзінства дзеянняў усіх навучэнцаў;

–выкарыстанне прыёмаў фарміравання вучэбнай дзейнасці праз маральнае выхыванне;

–улік узаемасувязі і ўзаемаўплыву якасцей, якія выхоўваюцца ў дадзены момант у дзяцей;

–сістэму маральнага выхавання варта разглядаць і ў паслядоўнасці развіцця тых ці іншых якасцей асобы па меры росту і разумовага стаўлення вучняў [1, с. 87].

Аналіз сутнасці паняццяў маральнае, этычнае і эстэтычнае выхаванне сведчыць пра тое, што для таго каб сацыяльна неабходныя патрабаванні, што прад’яўляюцца грамадствам, ператварыць ва ўнутраныя стымулы развіцця асобы кожнага вучня і выхоўваць такія сацыяльна-значныя якасці асобы, як абавязак, сумленне, годнасць, талерантнасць, міласэрнасць, фарміраваць першапачатковыя эстэтычныя ўяўленні. Неабходна улічваць тое, што любое выхаванне будуецца на пэўных прынцыпах, не выключэннем з’яўляецца і маральна-этычнае і эстэтычнае выхаванне. Можна вылучыць наступныя іх прынцыпы: 1) прынцып сістэмна-арганізацыйнага падыходу, які прадугледжвае скаардынаваную мэтанакіраваную працу ўсіх дзяржаўных і грамадскіх структур па выхаванні падрастаючага пакалення; 2) прынцып каштоўнасцей арыентацыі, які мае вызначальную значнасць для фарміравання сістэмы каштоўнасцяў вучня; 3) прынцып асобасна арыентаванага падыходу ў выхаванні, які прадугледжвае выкарыстанне асаблівых формаў і метадаў работы з улікам псіхалагічных асаблівасцяў кожнай узроставай сацыяльнай групы школьнікаў; 4) прынцып захавання гістарычнай памяці народа, які спрыяе станаўленню гістарычнай самасвядомасці нацыі, аказвае дабратворны ўплыў на фарміраванне высокамаральнай, сацыяльна актыўнай асобы, якая ўмее ажыццяўляць сацыяльны прагноз, зыходзячы з разумення рэалій сучаснасці, інварыянтнай да мінулага і альтэрнатыўнасці будучыні, усведамляць гістарычную адказнасць за сваю дзейнасць; 5) прынцып выхывання на традыцыях: культурных (захаванне і прымнажэнне гістарычных і духоўных дасягненняў беларускага народа), базавых (беражлівае стаўленне да гераічнага мінулага, быць узорам самаадданага служэння народу і краіне, святкаванне вялікіх для Беларусі падзей і дат), працоўных (культура вытворчасці, свядомае станаўленне да працы ў інтарэсах чалавека, грамадства і дзяржавы); 6) мастацка-творчая дзейнасць і самадзейнасць вучняў.

Навукоўцамі-педагогамі не раз было даказана, што навучанне ў пачатковай школе – важны этап у жыцці кожнага навучэнца, так як адбываецца не толькі яго навучанне, але і выхаванне. Так, беларускія навукоўцы П. П. Коцікава і В. Г. Кухаронак сцвярджаюць, што навучанне ў пачатковых класах – гэта перыяд развіцця, калі дзіця з уласцівай яму непасрэднасцю можа максімальна выказаць свае пачуцці і светаадчуванні, перыяд яго рознабаковага развіцця. Менавіта таму на сучасным этапе перад школай паўстае задача пошуку такіх формаў і метадаў маральна-этычнага і эстэтычнага выхавання малодшых школьнікаў, якія б максімальна стымулявалі развіццё эстэтычнай свядомасці дзіцяці, яго эмацыянальнай сферы, культуры паводзін, прыгожых учынкаў, творчай актыўнасці. Немалаважна і ўкарэнне гэтых формаў і метадаў або іх элементаў, ва ўсе віды дзейнасці вучняў у школе, каб працэс маральна-этычнага эстэтычнага выхавання вучня быў бесперапынным.

Пад метадам выхавання навукоўцы (В. А. Сласценін, І. Ф. Ісаеў, Я. М. Шыянаў і інш.) разумеюць спосаб ўзаемнага супрацоўніцтва паміж настаўнікамі і выхаванцамі для дасягнення найбольш эфектыўных вынікаў выхавання і развіцця. Агульная функцыя метадаў выхавання, канчатковы вынік іх прымянення – гэта фарміраванне свядомасці і паводзін школьнікаў у адпаведнасці з тымі патрабаваннямі, якія прад’яўляе грамадства. Задачы маральна-этычнага эстэтычнага выхавання вырашаюцца усімі навучальнымі прадметамі і відамі вучэбна-пазнавальнай і паўсядзённай дзейнасці як у рамках традыцыйных, так і інавацыйных, асобасна-арыентаваных педагагічных тэхналогій. Такім чынам, формы і метады эстэтычнага выхавання ставяць вучня ў цэнтр педагагічнай сістэмы і забяспечваюць камфортныя і бесканфліктныя ўмовы яго развіцця.

Літаратура:

1. Ковалев, Н. Е. Введение в педагогику / Н. Е. Ковалев, Б. Ф. Райский, Н. А. Сорокин. – М.: Просвещение, 1987. – 230 с.